Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 4 (133), 2022

*УДК: 94:378(476.2)«192/193»*

# Гомельскі рабфак: спроба першая, няўдалая

В.У. Цацарын

У артыкуле разгледжана першая спроба стварэння ў Гомелі рабфака – навучальнай установы, якая, паводле задумкі савецкай улады, павінна была рыхтаваць кадры адпаведных класаў для паступлення напрамую ў вышэйшую школу. Аўтар перадае асноўныя палажэнні, паводле якіх існавалі рабфакі ў РСФСР напачатку 1920-ых гг., а таксама на архіўных матэрыялах – асноўныя накірункі, праблемы і дасягненні рабфака ў Гомелі ў 1923–1924 навучальным годзе. Такім чынам шмат архіўных дадзеных уводзіцца ў навуковы зварот.
**Ключавыя словы:** рабфак, вну, Гомельская губерня, адукацыя, педагагічны працэс.

The article examines the first attempt to establish a faculty for workers in Gomel. It was a form of an educational institution. According to the Soviet authorities the aim of the faculty was to train personnel for the relevant classes to enter directly into higher education. The author conveys the main provisions according to which the faculties existed in the RSFSR in the early 1920s. Based on the archival materials the author gives the main directions, problems and achievements of the faculty in Gomel in the 1923–1924 academic year. Thus a lot of archival data are introduced into scientific circulation.
**Keywords:** faculty for workers, university, Gomel province, education, pedagogical process.

Напачатку XX ст. адбыліся сур’ёзныя змены на палітычнай карце Еўропы. У выніку Першай сусветнай вайны некаторыя дзяржавы зніклі, іншыя з’явіліся. Акрамя гэтага, сацыяльныя ўзрушанні паклалі пачатак падзелу свету на капіталістычны і сацыялістычны лагеры. Тэрыторыя Беларусі ў выглядзе БССР і, у прыватнасці, цяперашняя Гомельшчына, адносілася да апошняга. Праўда, да 1924–1926 гг. яна ўваходзіла ў склад БССР толькі часткова. Сам Гомель з’яўляўся цэнтрам губерні РСФСР.

Савецкая ўлада будавала краіну з адкрытых і ясна абвешчаных класавых пазіцый. І тут існавала вялікая праблема: рабочыя і сяляне не толькі не мелі вышэйшай адукацыі (ва ўсялякім выпадку у сваёй абсалютнай большасці), але і традыцый да яе імкнуцца. Спецыялісты ж, якія мелі вышэйшую адукацыю, натуральна, былі патрэбны і запатрабаваны як у тэхнічнай, так і ў гуманітарнай сферы. Улады выкарыстоўвалі існаваўшыя кадры. Аднак адначасова і імкнуліся насыціць вну студэнтамі з «правільных» класаў: рабочымі і працоўным сялянствам. Забяспечыць не толькі паступленне іх у вну, але і магчымасць там вучыцца (з прычыны дрэнных «стартавых пазіцый» у плане ўзроўню адукаванасці) павінны былі рабочыя факультэты, ці рабфакі.

Згодна з «Палажэннем» аб рабочым факультэце, яго мэтай была «подготовка к занятиям в высших учебных заведениях исключительно лиц из среды пролетариата и трудового крестьянства» [1]. У Гомелі рабфак быў упершыню адкрыты ў 1923–1924 гг. і праіснаваў толькі названы навучальны год. Рабфакі, перш за ўсё, адкрывалі ў саміх вышэйшых навучальных установах. Аднак у буйных гарадах, па ўзгадненню з упраўленнем прафесійнай адукацыі народнага камісарыята асветы, таксама адкрывалі. Менавіта гэтым і скарысталіся ў Гомелі. Згодна з выпіскай з пратакола № 49 Бюро Гомельскага губкама РКП(б) ад 13 жніўня 1923 г., да 15 верасня рабфак павінен быў быць адкрытым [2].

Падрыхтоўчую работу актыўна праводзілі летам 1923 г. Рабфаку перадалі будынак былой жаночай гімназіі па вуліцы Білецкага, дом 8. Можна канстатаваць, што бурныя падзеі ўсталявання ў Гомелі савецкай ўлады для былой гімназіі не прайшлі проста. Ва ўсялякім выпадку, у камісію па прыёмцы рамонтных работ напачатку верасня быў спецыяльна запрошаны інжынер таварыш Брагінскі [3]. Таксама рабіліся замовы розным прадпрыемствам і прыватным майстрам Гомеля на выраб рознага кшталту мэблі [4].

Загадчыкам рабфаку быў Янкоўскі Рафаіл Акімавіч, які праходзіў па штатах з кваліфкацыяй журналіст. Штат супрацоўнікаў вялікім не быў. Вычэбнай часткай заведаваў спецыяльна запрошаны са Старадуба (прыйшлося і сям’ю перавозіць) Мейер Усевалад

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Паўлавіч. Цікава, што ў выпісаным яму пасведчанні прысутнічае назва Гомельскі рабочы факультэт імя 25-годдзя РКП [5], а пазней у назве стала ўжывацца імя У.І. Леніна, з-за чаго Янкоўскаму нават прыйшлося ехаць у Маскву даваць абгрунтаванне гэтаму, бо аддзел рабфакаў упраўлення прафесійнай адукацыі не вельмі ахвотна пагаджаўся на прысвойванне «гучных» назваў, пра што разаслаў спецыяльны цыркуляр [6]. На жнівень ў ведамасці на жалаванне адміністрацыйна-гаспадарчаму персаналу значацца таксама справавод Салунскі і машыністка Аронава [7]. Існавала і некаторая «цякучка» кадраў. Тую ж Аронаву ўжо 2 верасня адкамандзіравалі на біржу працы «как неудовлетворившую требования работы на Рабфаке» [8]. Самы вялікі штат адміністрацыйна-гаспадарчых супрацоўнікаў амаль не перавышаў дзесятак чалавек: загадчык рабфакам, загадчык вучэбнай часткі (ён жа і выкладаў), сакратар (быў з навучэнцаў), загадчык гаспадаркі, камендант, кіраўнік справамі, машыністка, бібліятэкарка, сторож і дзве прыбіральшчыцы. Пры гэтым скарачэнні адбываліся перыядычна, асабліва пасля аб'яўлення аб ліквідацыі Гомельскага рабфака.

Згодна з агульнапрынятай структурай рабфак складаўся з наступных падраздзяленняў. Пры загадчыку ствараўся прэзідыум (ад 3 да 5 чалавек), у склад якога таксама ўваходзілі намеснікі па вучэбных і студэнцкіх справах і па жаданні прадстаўнікі губвыканкамаў, губернскіх саветаў прафсаюзаў, губкамаў РКП(б) і інш. Семестравыя і гадавыя справаздачы, планы развіцця, расходы і г. д. разглядаў савет рабочых факультэта: прэзідыум, 5 выкладчыкаў, 5 студэнтаў, прадстаўнікі праўлення вну, губвыканкама, губкама РКП(б), РКСМ, а па ўзгадненню з кіраўніцтвам рабфака – і прадстаўнікі гаспадарчых арганізацый. Не радзей за 2 разы на месяц павінны былі склікацца прадметныя камісіі для абмеркавання размеркавання прадметаў паміж выкладчыкамі, выканання праграмы, вынікаў навучаня і інш. Складаліся яны з роўнай колькасці выкладчыкаў прадмета і студэнтаў. Не радзей за 2 разы на семестр скліkаліся курсавыя нарады (колькасць студэнтаў на іх павінна была адпавядаць колькасці выкладчыкаў) для абмеркавання аб'ёму ведаў, унутранай узгодненасці паміж курсамі, перасоўвання і колькасці студэнтаў у групах, паспяховасці і г. д. Органам студэнцкага самакіравання былі групавыя тройкі [9].

Згодна з «Палажэннем» працаваць у рабфаках маглі выкладчыкі вну, «а также лица, обладающие достаточным педагогическим или научным стажем» [10]. На паседжанні прэзідыума Гомельскага рабфака (7 верасня 1923 г.) былі створаны тры прадметныя камісіі: фізіка-матэматычная, прыродазнаўча-геаграфічная і гуманітарная. Першую ўзначаліў Гольдбурт, увайшлі ў склад Мейер, Парыбок, Альтшулер, Грамыка. У астатніх старшынь не абралі. Прыродазнаўча-геаграфічную склалі Балабушэвіч, Міцераў, Рассаткевіч, Воранаў. А ў гуманітарную камісію ўвайшлі Біруковіч, Котаў, Казлоў, Гройпінер, Янкоўскі, Куніца, Віргански [11]. Тут жа пастанавілі, што заняткі пачынацца будуць а дзевятай ранку і цягнуцца 45 хвілін (перапынкі – па 10). Што датычыць колькасці ўрокаў на тыдзень для выкладчыка, то яна, напэўна, залежыла ад прадмета: ад 5–6 (Куніца, Казлоў, Янкоўскі, Віргански) да 14–16 (Біруковіч, Альтшулер, Гольдбурт, Рассаткевіч). Прыкладна такім жа складам выкладчыкаў рабфак і скончыў навучальны год. Толькі ў першым семестры за сістэматычныя пропускі заняткаў і адсутнасць кантакту з групамі быў звольнены географ Міцераў.

Што датычыць набору, то ён рэгламенаваўся па некалькіх накірунках. Прэтэндэнты павінны былі мець 18-цігадовы ўзрост. Іх працоўны стаж павінен быў складаць не меньш за тры гады, прычым праца павіна была выконвацца фізічная (прамысловасць, сельская гаспадарка). У стаж гэты залічвалі тэрмін службы ў Чырвонай Арміі. Паходжанне абітурыентаў – пралетарыі ці сяляне. Але да апошніх уводзілі яшчэ адно патрабаванне: яны павінны быць з сем'яў бяднейшых землеробаў, якія тры апошнія гады працавалі без эксплуатацыі чужой працы. Калі ў воласці мелася ячэйка РКП ці РКСМ, то пажадана была яе рэкамендацыя. Тыя, хто не меў у папярэднія тры гады стажа непасрэднай фізічнай працы, маглі стаць навучэнцамі рабфакаў, калі былі камуністамі (камсамольцамі) такі ж прамежак часу. Але гэта толькі, калі на факультэце пасля даслання заяў заставаліся вольныя месцы.

Усе, хто адпавядаў названым крытэрыям, павіны былі праходзіць уступныя выпрабаванні. Прэтэдэнт павінен умець бегла чытаць і пісаць па-руску і ведаць чатыры дзеянні (складанне, вылічэнне, памнажэнне і дзяленне) над цэлымі лічбамі. Дыялектычнасць падыходу была ў тым, што, з аднаго боку, неаднаразова цыркуляры падкрэслівалі, што

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

нельга перагінаць са складанасцю. Некаторыя памылкі ў пісьме ці слабое разуменне прачытанага не павінны стаць перашкодай для залічэння на рабочы факультэт [12]. З іншага, не меньш рашуча цыркуляры асуджалі ператварэнне рабфакаў у лікбезы [13].

Акрамя гэтага існавала развёрстка. У асноўным, размекаванне кандыдатаў павінна было адпавядаць прапорцыі: 60 % – ад прафсаюзаў, 30 % – ад партарганізацый, 10 % – ад земляробаў. У мандатнаю камісію для правядзення ўступных выпрабаваняў уключаліся прадстаўнік прэзідыума рабфака (кіраўнік камісіі), прадстаўнікі губпрафсавета (упрафбюро), губкама (укама) РКП(б), РКСМ, мясцовага аддзела народнай адукацыі і два прадстаўнікі камсамольскай ячэйкі рабфака. Выпрабавані павінны былі пачынацца не раней за 1 чэрвеня [14].

Адкрыўшыйся ў Гомелі рабочы факультэт павінен быў навучаць 150 чалавек, з якіх «100 на полном госиждивении, а 50 человек на собственном иждивении и за счёт командирующих учреждений» [15]. Даводзіўшаяся прапорцыя не вытрымлівалася, бо паміж прафсаюзамі і партарганізацыямі месцы падзялілі пароўну. З 75 прафсаюзных месцы размяркоўваліся паміж 21 саюзам, прычым на поўным дзяржзабеспячэнні вучыцца павінны былі 50 чалавек без дэталёвага іх размеркавання. Для тых, хто ішоў ад партарганізацый губерні, квоты ўводзіліся наступныя: Гомельскі горрайвыканкам: за дзяркошт – 6, за ўласны – 4–10 чалавек, Навабеліцкі, адпаведна – 5 і 3–8, Залінейны – 5 і 2–7, Клінцы атрымалі 5 і 2–7 месцаў, Магілёў – 3 і 2–5, Навазыбкаў – 4 і 2–6, Гомельскі павет – 2 і 2–4, Рагачоў – 3 і 2–5, Клімавічы – 3 і 1–4, Старадуб – 3 і 2–5, Рэчыца – 3 і 2–5, Чэрыкаў – 2 і 2–4, губернскі камітэт – 5 [16]. Такім чынам, калі б усе партарганізацыі даслалі максімальна магчымую колькасць людзей, то толькі за ўласны кошт прыбыло б вучыцца 70 чалавек. Што датычыць сялянскай беднаты, то яе квоту перадалі партарганізацыям, вырашыўшы, што нават беспартыйных будуць дапускаць да выпрабаванняў толькі па рэкамендацыі валасных выканаўчых камітэтаў РКП, аддаючы перавагу дэмабілізаваўшымся чырвонаармейцам. Пры гэтым доля сялян-земляробаў павінна была скласці 25 % ад усіх прадстаўленых партарганізацыямі [17].

Падчас уступнай кампаніі, канешне, некаторыя моманты па персаналіях можна было ўрэгуляваць. Так, Залінейны раён не заняў свае тры месцы, таму іх прапанавалі Дарпрафсаюзу [18]. З Гомельскім гаррайкамам таксама прыйшлося перапісвацца: некаторыя адкамандзіраваныя не з’явіліся, два прадстаўнікі гэтай партыйнай установы не прайшлі выпрабаванні, былі заяўлены замены, аднак, на 17 верасня 1923 г. два месцы за свой кошт былі вольнымі [19]. А, напрыклад, нехта грамадзянін вёскі Патапаўка Буда-Кашалёўскай воласці Рагачоўскага раёна Георгій Андрэевіч Корцелеў, атрымаў адмоўную рэзалюцыю на залічэнне яшчэ 31 жніўня «за адсутнасцю вакансіі» [20].

Яшчэ да пачатку ўступных выпрабаванняў (11 верасня) была праведзена нарада з прадстаўнікамі партыйных органаў і розных галіновых прафсаюзаў. Выступаючы на ёй, Янкоўскі патлумачыў, што рабфак без дапамогі прадпрыемстваў губерні не здолее ўтрымліваць усіх 150 судэнтаў, маючы на ўвазе тых, хто не быў на дзяржзабеспячэнні. Таму ён ультыматыўна прапаноўваў прадстаўнікам адпаведных прафсаюзаў заключыць з рабфакам дамовы на аплату за сваіх студэнтаў. У адваротным выпадку гэтыя навучэнцы аказаліся б сам насам з праблемай свайго ўтрымання. Выказваючыся ў адказ, кіраўнік губпрафадукацыі Макоўскі рэзка выступіў супраць прыняцця падобных студэнтаў на забеспячэнне рабфакам за фінансавую кампенсацыю ад прафсаюзаў. Ёні заявіў, што «стыпендыі альбо зусім не будуць атрымлівацца, альбо будуць паступаць неакуратна». Тым не менш, прадстаўнікі прафсаюзаў запэўнілі, што праблем не будзе. Таму вырашылі, што рабфак забяспечвае ўсіх сваіх навучэнцаў усім аднолькава. А за гэта штомесяц атрымлівае грошы ад прафсаюзаў у тых жа памерах, што і дзяржстыпендыя [21]. Трэба заўважыць, што Макоўскі шмат у чым мей рацыю. Перыядычна кіраўніцтву рабфака прыходзілася нагадваць розным прафсаюзам аб неабходнасці не тое, што наперад унесці грошы за свайго студэнта (а дамаўляліся пераводзіць у чырвоным налічэнні не пазней за 30 число бягучага месяца за будучы), але і патрабаваць пагасіць выдаткі за мінулы перыяд і нават здымаць некалькі студэнтаў з давольства. Тым не менш, апошняй мерай не злоўжывалі. Па меры магчымасці наадварот імкнуліся паспрыяць таму, каб студэнты больш думалі пра вучобу, чым пра спосаб існавання, і хадайнічалі аб іх

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

пераводзе на навучанне за дзяржаўны кошт. Як прыклад, можна прывесці захаваўшыйся ліст-заяву ад некага Калінкова. Заява напісана была студэнтам алоўкам, прычым не самым зразумелым почыркам, не заўсёды літататурнай мовай. Сэнс просьбы ў тым, што ён, Калінкоў, тры гады адслужыў у Чырвонай Арміі, быў на фронце, змагаўся з бандытамі ў Чэрыкаўскім павеце. Пасля дэмабілізацыі быў абраны ў старшыні сельсавета, «проводил строгую классовую прямоту… добросовестно и аккуратно без всяких пропустительств и уступок местным кулакам, почему имею много врагов, которые не сумев бороться со мною в открытой борьбе, решили пойти на… преступление, чтобы убрать меня». Апісвалася начная перастрэлка, з якой Калінкоў выйшаў пераможцам. У рабфак ён паступіў за свой кошт. Але «родители учить меня отказались ввиду того, что не имеют средств». І каб не даць магчымасці мясцовым «кулакам и прочим негодяям» парадвацца (а яны казалі: «куда с его карманом учиться»), Калінкоў просіць перавесці яго на дзяржзабеспячэнне. На заяве за подпісам Янкоўскага і датай 25 верасня 1923 г. стаіць рэзалюцыя аб накіраванні адпаведнага хадайніцтва ў Гомельскі павятовы выканаўчы камітэт [22]. Падобныя ж просьбы, праўда без захаваўшыхся дэталёвых і маляўнічых абгрунтаванняў, пісалі і некалькі іншых студэнтаў.

28 верасня 1923 г. прайшло пасяджэнне прэзідыума рабфака, на якім абмяркоўвалі вынікі ўступнай кампаніі. Яе правядзенне, у цэлым, было прызнана здавальняючым, хаця развёрстку па сялянах не выканалі. Заставаліся 10 стыпендый ад Гомельскага выканаўчага камітэта, якія прапаноўвалі размеркаваць, па-магчымасці, па 1 на павет, але студсавет павінен быў за два дні выявіць найбольш маючых патрэбу, асабліва сярод сямейных [23], што і было зроблена.

Тут жа пастанавілі, што, акрамя заняткаў, патрэбна вызначыць дні для дадатковых кансультацый з 17.00 да 19.00 для адстаючых (2 дні па рускай мове і 2 дні па матэматыцы). Запланавалі і адкрыццё кружкоў: прыродазнаўчага, літаратурнага, грамадазнаўства, спартыўнага, харавога і літкалегію. Па магчымасці, праводзіць іх сіламі ўласных выкладчыкаў. Пры неабходнасці, прыцягваць знешніх сумяшчальнікаў [24]. Асноўны распарадак дня зацвердзілі 22 кастрычніка. З панядзелка па суботу рабфакаўцы вучыліся з 9.00 да 14.30. Потым да 17.00 – вольны час на абед і адпачынак, пасля чаго пачыналіся двухгадзінныя кансультацыі і падрыхтоўка ўрокаў. Кружкі дзейнічалі з 19.00 да 21.00: літаратурны і грамадазнаўчы ў панядзелак і пятніцу, прыродазнаўчы ў сераду, спартыўны ў аўторак (18.00–21.00) і нядзелю (9.00–13.00). У нядзелю ж а 17-ай збіраўся хор. Заставалася два вечары, якія размеркавалі так: па чацвяргах з 19.00 быў партдзень, а ў суботу з 19.00 – саюзны дзень.

Шмат увагі на рабфаку ўдзялялі і фарміраванню бібліятэкі. Яшчэ ў жнўні даваўся запыт на выдзяленне 6000 рублёў на набыццё вучэбных дапаможнікаў і літаратуры. Аднак, як адзначаў Янкоўскі, 10 лістапада вылучылі на гэтыя мэты толькі 2500 рублёў [25]. Тым не меньш, кнігі набываліся як у масцовай краме, так і ў Маскве, нават нягледзячы на перарасход. На 19 лістапада 1923 налічвалася больш за 2500 кніг, у асноўным вучэбных. Забяспечанасць падручнікамі ацэньвалася 3–5 чалавек на 1 кнігу. Уціскалі іншыя патрэбы, перш за ўсё, адміністрацыйна-гаспадарчыя расходы [26].

Што датычыць непасрэднага навучальнага працэсу, то Масква патрабавала, каб рабочыя факультэты не выкарыстоўвалі традыцыйны лекцыйны метад. Замест яго ўводзіўся лабараторна-даследчы. Ён узгадваецца ў цыркуляры аддзела рабфакаў Галоўпрафадука № 15 ад 23 мая 1923 г. [27], а потым некалькі разоў пра яго нагадвалі. Сутнасць метаду – практыкаарыентаванасць, калі казаць сучаснай мовай. Студэнты павінны былі дзяліцца на групы, больш часу праводзіць у лабараторыях, вырашаць практычныя заданні. Патрабавалася ўводзіць экскурсіі, пашыраць падрыхтоўку навучэнцамі дакладаў і рэфератаў. Што датычыць новых падручнкаў і дапаможнікаў, а тым больш абсталявання для лабараторый, то адзначалася, што насычэнне імі – справа доўгая. Прапаноўвалася больш абапірацца на ўласныя магчымасці і сілы.

Нават вучэбныя праграмы на 1923–1924 г. зацвердзіць абяцалі не раней за 15 кастрычніка [28] (па факце даслалі значна пазней, калі першы семестр ужо скончыўся). Арыентавацца патрэбна было на праект, прыняты на II Усерасійскім з'ездзе рабфакаў і апублікаваны ў часоаісе «Знамя рабфаковца». Змены датычылісь рускай мовы (і літаратуры), грамадазнаўчых навук, фізікі, хіміі, прыродазнаўства і геаграфіі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Што датычыць гісторыі, то было вырашана скасаваць раздзелы, прысвечаныя старажытнасці (Усход, Грэцыя, Рым). Нарысна давалася першабытнае грамадства, сярэднявечча Еўропы. Аснову курса стала складаць так званая эпоха «Прамысловага капіталізму». Пры гэтым адзначалі, што асноўную ўвагу патрэбна ўдзяляць гаспадарчым формам, потым – эканамічнай структуры грамадства. Ідэалагічныя моманты – у апошнюю чаргу. Відавочны пераход да спрошчанай марксісцкай схемы гісторыі. Можна зразумець, чаму з рускай літаратуры пакінулі для малодшага курса толькі невялікія апавяданні пра класавую барацьбу, а на старэйшых – калямарксісцкую літаратуру мяжы стагоддзяў. Цяжэй патлумачыць, чаму, напрыклад з рускай мовы прыбралі амаль усю фанетыку, з хіміі – арганіку [29]. Калі вяртацца да гісторыі, ці грамадазнаўства ўвогуле, то цыркуляр аддзела рабфакаў № 24 патрабаваў перагледзець спісы выкладчыкаў, прычым, у першую чаргу, як раз названых курсаў. Патрабавалася даслаць у аддзел іх спісы, анкеты, водгукі вучэбнай часткі і прэзідыума рабфака пра дзейнасць выкладчыка, такія ж водгукі кам'ячэйкі груп, у якіх ён працуе (можна агульным апытаннем, можна праз групавыя тройкі) [30].

Выкладанню грамадазнаўства (ва ўсялякім выпадку выкананню праграмы) менавіта ў 1923–1924 навучальным годзе не садзейнічала і пастанова наркамасветы ад 8 лістапада тэрмінова прыпыніць гэты курс і замест яго правесці «лекцыі, гутаркі і заняткі па пытаннях міжнароднага становішча ў сувязі з падзеямі ў Германіі» [31]. Дасылалася праграма лекцый і гутарак, якая сама цягне на добры курс вну (4 раздзелы). І асобна ад гэтай жа даты выйшаў цыркуляр аддзела рабфакаў тэрмінова выканаць дадзенае распараджэнне [32].

Для бягучага кантролю засваення курсаў праводзіліся групавыя канферэнцыі. Па выніках праверкі колькасць непаспяваючых студэнтаў у кожнай з 4 груп была прыкладна аднолькавай і роўнай. Цалкам паспяваючымі быў 91 студэнт. Праблемы з адным прадметам мелі 36 чалавек, з двума – 12, з трыма – 6 [33]. Такім чынам, прабемы з навучаннем мелі 54 чалавекі, гэта значыць больш за палову ад тых, хто іх не меў.

31 снежня 1923 заслухалі старшынь прадметных камісій па выніковай паспяховасці за семестр. Старшыня па рускай мове Біруковіч адзначыў, што кантынгент дарослы, але да паступлення кніг не чыталі і друкаваны тэкст напачатку разбіралі з цяжкасцю. Таму выкладчыкі засяродзіліся на элементарных ведах і навыках. Граматычныя заняткі таксама прывязваліся да чытання. Таму паспелі меньш, чым належыць і планавалі. Дакладчык адзначыў, у цэлым, «слабую падрыхтаванасць да сістэматычнай разумовай працы, адсутнасць дысцыпліны думкі, непрызвычайнасць да якога-кольвек адцягнутага мыслення». Больш аптымістычным быў старшыня па матэматыцы Гольдбурт. Ён пералічыў, адзначыўшы першапачатковыя цяжкасці, досыць вялікія поспехі студэнтаў. Скончыў ён досыць паэтычным параўнаннем: «Говорить об обязательном результате трудно. Мы перешли от механического усвоеня к идейному, пришли к необходимости осознавать то, что делается. Словом, состав переходит на новый путь, стрелка переведена». Узнікае пытанне: ці то гаворка ідзе пра іншых студэнтаў, ці то дзіўным чынам склад рабфакаўцаў падабраўся з матэматычнымі схільнасцямі, ці то патрэбна ўмець выкладаць (альбо рабіць даклады?), знаходзіць падыход да складаных вучняў. Патрэбна зазнацыць, што і Гольдбурт, і яшчэ адзін выкладчык матэматыкі Альтшулер некалькі разоў ездзілі ў камандзіроўкі ў іншыя рабфакі краіны для пераймання досведу выкладання. Але аптымістычныя настроі цалкам знікаюць пры чытанні даклада старшыні камісіі па прыродазнаўству і геаграфіі Мейера. Той, канешне, адзначыў фактар Міцерава (пра яго – вышэй). Але да галоўнай прычыны невыканання плана выладання па курыруемых ім курсах аднёс адсутнасць ведаў у паступіўшых на факультэт. Імкнуліся выкарыстоўваць лабараторны метад, але не па ўсіх тэмах гэта было магчыма. Старшыня камісіі па грамадазнаўству адзначыў, што з-за існаваўшых цяжкасцей (адсутнасць праграмы, ранейшае, чым меркавалася заканчэнне семестра, пропускі заняткаў некаторымі выкладчыкамі) удалося толькі намеціць асноўныя праблемы грамадазнаўства і першабытнай гісторыі. Ігнаравалі ў Гомелі і вывучэнне «Германскай рэвалюцыі», «часткова за недахопам часу, а таксама таму, што было вырашана адкласці гэта да таго часу, пакуль не будуць пройдзены перыяд імперыялізму і эпоха сусветнай вайны». Мейер зрабіў і агульныя высновы: цалкам задачы на семестр не выканалі, але новыя метады выкладання,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

выключаючыя лекцыі, выкладчыкі засвоілі. Адзнакі, якія выстаўлялі выкладчыі, супадалі, у большасці, з тымі, што ставілі таварышам групы. У выніку ставіліся тры адзнакі: «паспяхова, недастаткова паспяхова і непаспяхова». Вынікі: 50 % студэнтаў паспявалі па ўсіх прадметах, 25 % не паспявалі па адным, 9 % – па двух, 10 % – па трох, 6 % – больш чым па трох [34].

Было пастаўлена пытанне аб адлічэнні (як тады пісалі – звальненні) некаторых студэнтаў. Але прадстаўнік губернскага аддзела адукацыі Макоўскі настойліва раіў звольніць толькі аднаго (па студэнце Ягораве з'явіліся падозранні ў недабранадзейным паходжанні). У рэшце непаспяваючыя студэны працягнулі вучыцца яшчэ адзін семестр.

Навучанне ў другім семестры працягвалася практычна па тых жа курсах. Паспяховасць крыху вырасла. Цікава, што тыя студэнты, якіх прапаноўвалі звольніць па выніках першага семестра, так і не выправіліся.

Аднак галоўнай праблемай Гомельскага рабфака была фінансавая. І яна суправаджала яго ўвесь навучальны год. У 1923 календарным годзе прыходзілася некалькі разоў прасіць у губфінаддзела крэдыты з-за несупадзення пачатку фінансавага і навучальнага гадоў. Аднак гэта вырашылі. Пра праблемы з пераводам сродкаў на ўтрыманне студэнтаў, камандзіраваных прафсаюзамі ўжо ўзгадвалася. Яны былі ўвесь год. Да прыкладу, 7 мая 1924 г. быў дасланы напамін дырэктару завода «Палетарый». Напамін заканчваўся эмацыйна:«Отговорка незнанием является или недопустимой в данное время канцелярской волокитой, или же нежеланием платить вовсе» [35].

Аднак галоўную праблему фінінсавага плана для Гомельскага рабочага факультэта прынесла першае ўзбуйненне БССР. 26 лістапада 1923 г. губвыканкам праз загадчыка губернскім аддзелам народнай адукацыі Гартмана даслаў распараджэнне «ў сувязі з адыходам некаторых паветаў да Беларусі… прапаноўваецца Вам зрабіць скарачэнне слухачоў уверанай Вам школы на 20 %». З дакумента вынікае, што гэта не было накіравана менавіта супраць рабфака, бо падобныя распараджэнні атрымалі ў так званай «Школе деревенщиков» і Губпартшколе. Тэрмін давалі да 3 сакавіка [36]. 1 сакавіка на пасяджэнні губвыканкама меркаванні аб скарачэнні падзяліліся.

Янкоўскі паспрабаваў дабіцца пераарыентацыі фінансавання з Гомеля на Маскву, хаця б часткова. Ён абгрунтоўваў гэта тым, што з губерні ў склад БССР перадаюцца ў асноўным сельскагаспадарчыя раёны. А ў рабфаку земляробы складаюць абсалютную меньшасць. Асноўныя ж прамысловыя цэнтры з фабрыкамі застаюцца ў губерні (тэкстыльная фабрыка і скуразавод у Клінцах, папяровыя фабрыкі ў Добрушы і Суражы (трэцяе месца па вытворчасці ў РСФСР), запалкавыя заводы ў Навазыбкаве, Рэчыцы і Гомелі, лесазаводы і хімпрамысловасць у Гомелі). Таму скарачаць колькасць студэнтаў рабфака немэтазгодна, тым больш, што прычыны толькі фінансавыя, а да дзейнасці факультэта прэтэнзій няма [37]. Аднак з Масквы прыйшла лаканічная адмова [38]. Калі прагледзець цыркуляры аддзела рабфакаў таго часу, кідаецца ў вочы тэма скарачэння, узгаднення з вну набораў, больш жорсткага стаўлення да паступаючых на рабфакі і г. д. Таму просьба Янкоўскага ішла яўна ўразрэз з дадзенай лініяй.

Вучэбны працэс працягваўся. Рабфак атрымліваў распараджэнні аб правілах набора на наступны навучальны год. Аднак некаторая нярвовасць на рабфаку існавала. У выніку 30 красавіка 1924 калегія Галоўпрафадука вырашыла, а 20 мая калегія Наркамасветы зацвердзіла пастанову аб закрыцці з 1 ліпеня Гомельскага рабфака. Тыя студэнты, хто задавальняў правілам прыёма на новы навучальны год, а таксама выказаў такое жаданне, пераводзіліся агулам у Смаленскі рабфак. Студэнтаў з Беларусі – у беларускія рабфакі [39].

Для адміністрацыі дадалося работы: складаліся спісы пераводзіўшыхся ў Смаленск [40], масава пісаліся хаактарыстыкі на выкладчыкаў і супрацоўнікаў. У вынку 104 навучэнцы перавялі на другі курс Смаленскага рабфаку, выкладчыкі і супрацоўнікі атрымалі «прэміі» з фонду сабранай бібліятэкі. Гомельскі рабфак быў закрыты. Але, як аказалася,ненадоўга. Ужо ў складзе БССР рабочы факультэт у Гомелі быў адкрыты наноў.

Першая ж спроба паказала, што нават за адзін навучальны год, нават ва ўмовах, калі веды не з'яўляюцца асноўным паказчыкам, каб стаць навучэнцам, дабівацца добрых вынікаў можна. Нягледзячы на тое, што большасць выкладчыкаў Гомельскага рабфаку была сумяшчальнікамі, яны старанна рабілі тут сваю справу, паднімаючы «нулявы» ўзровень сваіх студэнтаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Літаратура**

1. Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці (ДАГВ). – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 1.
2. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 5.
3. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 2.
4. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 28, 31, 33.
5. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 3.
6. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 75.
7. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 15–16.
8. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 59.
9. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 1–4.
10. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 3.
11. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 2. Арк. 1.
12. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 12.
13. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 204.
14. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 12.
15. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр.7. Арк. 18.
16. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 18.
17. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 18–19.
18. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 67.
19. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 79.
20. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 40.
21. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 68.
22. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 90.
23. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 2. Арк. 4.
24. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 2. Арк. 4.
25. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 2. Арк. 7.
26. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 3. Арк. 26.
27. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 23.
28. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 29.
29. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 29–30.
30. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 24.
31. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 61–67.
32. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 58.
33. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 3. Арк. 2.
34. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 3. Арк. 2–9.
35. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 120. Арк. 122.
36. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 117.
37. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 131.
38. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 135.
39. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 212.
40. ДАГВ. – Ф. 112. Воп. 1. Спр. 2. Арк. 32.

Гомельский государственный
университет имени Франциска Скорины

Поступила в редакцию 21.04.2022

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ